**Урок беларускай мовы. 10 клас**

**Тэма ўрока:** Лічэбнік: праблемныя пытанні правапісу, формаўтварэння і словаўжывання (10 клас)

**Мэта:** узнавіць, паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў пра лічэбнік як часціну мовы, спецыфіку яго ўжывання ў беларускай мове ў адпаведнасці з марфалагічнымі нормамі; садзейнічаць развіццю звязнага маўлення і мыслення; фарміраваць арфаграфічную пільнасць; спрыяць выхаванню экалагічна граматных адносін да акаляючага асяроддзя .

**Тып урока:** падагульненне і сістэматызацыя ведаў.

**Абсталяванне:** апорныя канспекты, карткі з заданнямі і тэкстамі, мультымедыйны праектар, презентация Мусор (нажмите CTRL и щелкните ссылку)

**Эпіграф:** "Лікі – і ёсць той бог, які кіруе светам" (Піфагор)

**Ход урока:**

**І. Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

1)Узаемнае прывітанне вучняў і настаўніка.

*Добры дзень! Сёння на ўроку мы будзем працаваць з даволі складаным і разнастайным матэрыялам, таму я заклікаю вас быць максімальна ўважлівымі , старыннымі і актыўнымі.*

2) Зварот да эпіграфа.

*Як вы разумееце такое выказванне Піфагора?*

Настаўнік. *У жыцці мы пастаянна сутыкаемся з лічбамі. Яны вакол нас усюды: у калонках газет і часопісаў, на тэлебачанні і радыё, на аб'явах у пад'ездзе і цэнніках у магазіне. Яны сапраўды кіруюць нашым жыццём.Таму сёння мы будзем гаварыць пра тую часціну мовы, якая рэгулюе правілы ўжывання лічбаў з пазіцый культуры маўлення.*

3) Пастаноўка мэты і задач.

Настаўнік. *Паглядзіце на тэму ўрока. Што вам па ёй ужо вядома? Запішыце свае адказы злева на старонцы ў сшытку, а тое, што хацелі б даведацца -*

*справа. Зачытайце, што ў вас атрымалася* ( адказы дзяцей). *Кажуць, "хочаш спадабацца – умей валодаць роднай мовай". Уменне правільна ўтвараць і ўжываць лічэбнікі – гэта паказчык маўленчай ультуры чалавека.*

*Сёння на ўроку вы, абапіраючыся на атрыманыя раней веды, зможаце ўдасканаліць свае навыкі ўжывання лічэбнікаў у маўленні, захоўваючы марфалагічныя нормы, а таксама правільна іх пісаць. Акрамя таго, лічэбнік – гэта асноўны элемент статыстыкі. Мы паназіраем за тым, як ужываецца лічэбнік у тэкстах і тым самым удасканалім свае камунікатыўныя якасці.*

4) Знаёмства з планам работы на ўрок.

Настаўнік. *Мы павінны паступова, крок за крокам, разгледзець 7 праблемных пытанняў, звязаных з ужываннем лічэбнікаў у маўленні, якія часцей за ўсё выклікаюць цяжкасці пры падрыхтоўцы да ЦТ. Разглядаць іх на аснове тэкстаў.*

**ІІ.Інфармацыйна-пошукавы этап.**

Актуалізацыя ведаў па тэме "Лічэбнік".

Настаўнік. *Правядзём бліц-апытанне. Ад вас патрабуецца не фармулёўка адказу на тое ці іншае пытанне, а ўменне правільна адрэагаваць на маё сцвярджэнне. Калі вы згодны з маім сцвярджэннем, то ставіце 1, калі не - 0.*

1.Лічэбнік – самастойная часціна мовы, якая абазначае лік, колькасць прадметаў і парадак прадметаў пры лічэнні. – 1

2.Прыкладам лічэбніка могуць быць словы двойка, тройня, пяцярня.-0

3.Усе лічэбнікі можна падзяліць на 2 разрады – колькасныя і зборныя. -0

4.Паводле складу лічэбнікі бываюць простыя і састаўныя.- 0

5.Простыя лічэбнікі складаюцца з аднаго слова.Напрыклад, пяцьдзясят.- 0

6.Лічэбнікі ад 5 да 30 скланяюцца як назоўнікі трэцяга скланення.- 1

7.У састаўных колькасных лічэбніках пры скланенні змяняецца кожная частка.- 1

8.Парадкавыя лічэбнікі змяняюцца па родах, ліках і склонах. – 1

9.У сярэдзіне лічэбніка **Ь** ніколі не пішацца. -0

*Які лік увас атрымаўся?(*100 001 110(сто мільёнаў адна тысяча сто дзесяць)

**III.Трэніровачна-карэкцыйны этап.**

**А. Праца з тэкстам №1.**

*1)Кен Нагучы – японскі альпініст, які ў 25 год стаў самым маладым пакарыц...лем самых высокіх вяршынь на 7 кантынентах. 2)Але аднойчы перад ім паўстаў засмечаны Эв…рэст. 3)Пасля ўзыходжан…я на вяршыню Нагучы сабраў групу д…браахвотнікаў, каб распачаць уборку. 4)У 2001 годзе каманда спусціла з Эверэста 1,6 тон…ы смецця, уключаючы 84 пустыя кіслародныя балоны. 5)Усяго на Джамалунгму група падымалася 5 разоў і ў выніку назбірала 9 тон смецця. 6) Аднак па сціплых падліках за апошнія 54 гады альпіністы пакінулі на Эверэсце каля 50 тон хламу.*

**Заданні да тэксту:**

1) Падрыхтуйцеся да выразнага чытання тэксту. Вызначце, дзе патрэбныя лагічныя насціскі, паўзы. Выберыце патрэбны тон, тэмп чытання, прымаючы пад увагу змест тэксту, яго моўныя асаблівасці.

2) Вызначце тэму, асноўную думку тэксту.

3) Дайце загаловак тэксту. Растлумачце сэнс назвы.

4) Вызначце стыль тэксту. Дакажыце справядлівасць вашага меркавання.

5) Да якога тыпу маўлення адносіцца дадзены тэкст? Дакажыце правільнасць меркавання.

6) Назавіце сродкі сувязі паміж 1-м і 2-м сказам ў тэксце? Паміж 4-м і 5-м? Які спосаб сувязі паміж сказамі?

9) Запішыце словы з прапушчанымі літарамі і растлумачце арфаграмы.

**Б. Актуалізацыя праблемных пытанняў.**

***<u>Праблема №1</u>: Захоўваць арфаграфічныя нормы пры напісанні простых, складаных і састаўных лічэбнікаў.***

Выпішыце з тэксту колькасныя лічэбнікі, якія абазначаюць цэлыя лікі: спачатку простыя, потым складаныя, затым састаўныя і растлумачце іх правапіс (2 вучні працуюць на дошцы).

***<u>Праблема №2.</u> Правільна ўтвараць формы колькасных лічэбнікаў, якія абазначаюць цэлы лік, дакладна спалучаць іх з назоўнікамі.***

Праскланяйце вусна лічэбнік 50.

***Хвіліна рэлаксацыі.*** 1)Рашыце прыклад: 24 + 46 = шЭсцьдзесят або шэсцьдзясЯт? (70)

2) Дастаньце мабільныя тэлефоны і пры дапамозе іх знайдзіце суму ўсіх цэлых лікаў, якія сустракаюцца ў тэксце. (234)

3) Адзін вучань скланяе лічэбнік 234 на дошцы, астатнія ў сшытку, вуснае каменціраванне па ходу выканання задання.

***Праблема №3.Правільна ўтвараць дробавыя лічэбнікі і дакладна спалучаць іх з назоўнікамі.***

Запішыце правільна дробавы лічэбнік, ужыты ў тэксце. (1,6) Якія правілы ўжывання дробавых лічэбнікаў вы памятаеце? Растлумачце канчаткі назоўніка і прыметніка ў словазлучэнні “84 пустыя кіслародныя балоны”.

***Праблема №4. Правільна ўтвараць формы зборных лічэбнікаў, дакладна спалучаць іх з назоўнікамі.***

Ад простых колькасных лічэбнікаў у тэксце ўтварыце зборныя *(пяцёра, дзявяцера)*.Праскланяйце адзін з іх пісьмова. Ці можна ў тэксце замяніць цэлы лік на зборны? Чаму?

***Праблема №5.Ужыванне і правапіс парадкавых лічэбнікаў.***

1) Назавіце парадкавы лічэбнік у тэксце. Праскланяйце яго. Чым адрозніваецца скланенне парадкавых лічэбнікаў ад колькасных?

2)Ад словазлучэння “25 год” утварыце складаны прыметнік і запішыце. Растлумачце правапіс.

**Праблема №6.Ужываць лічэбнікі ў вусным і пісьмовым звязным маўленні, без парушэння арфаграфічных і марфалагічных нормаў.**

1) Давайце яшчэ адзін раз выразна прачытаем тэкст. Ці здзівілі вас паводзіны альпініста? Вы змаглі б зрабіць гэтак жа на яго месцы? Як вы думаеце, што зрабіў Кен Нагучы са смеццем? *(аддаў на перапрацоўку).*

2)Колькі жыхароў у Беларусі? (9 317 000) Ці шмат мы смецім?

**В. Праца з тэкстам №2.**

1)Перакладзіце тэкст на беларускую мову. (Калі хопіць часу, словазлучэнні з лічэбнікамі варта запісаць).

*К слову, ежегодно в Беларуси образуется 4 миллиона тонн коммунальных отходов, из которых мы перерабатываем лишь 15,6%, в то время как в Германии этот процент около 64, а по ЕС в целом – 43,3%. На данный момент во всей Беларуси стоит лишь 75 тысяч контейнеров для раздельного сбора мусора, в то время как в одном Гамбурге – 300 тысяч.*

*(Дарэчы, штогод у Беларусі ўтвараецца 4 мільёны тон камунальных адыходаў, з якіх мы перапрацоўваем толькі 15,6%, у той час як у Германіі гэты працэнт каля 64, а па ЕС у цэлым – 43,3%(працэнты). На дадзены момант па ўсёй Беларусі стаіць каля 75 тысяч кантэйнераў для паасобнага збору смецця, у той час як у адным Гамбургу – 300 тысяч).*

2)Ці зможам мы дасягнуць калі-небудзь такога працэнту, як у Германіі? (адказы дзяцей).

3)Ці ведаеце вы, як перакладаецца слова **target** з англійскай мовы?(*мэта*). А што такое **target 99**?

**Г. Праца з тэкстам №3.**Прадстаўленне афіцыйнага сайту **www. target 99.by**

*"Мэта 99" – гэта грамадзянскі рух у падтрымку паасобнага збору смецця, які аб'ядноўвае жыхароў нашай краіны вакол агульнай ідэі: "Хочаш, каб стала лепей вакол, – рабі простыя рэчы: збірай паасобна бытавыя адыходы". Назва руху азначае, што краіна імкнецца да выкарыстання 99% камунальных адыходаў. За 2015 год у Беларусі было сабрана каля 600 000 тон смецця, якое пайшло на перепрацоўку. Для параўнання: 5 гадоў таму перапрацоўвалася амаль у 2 разы меней смецця – усяго 328,4 тоны(прыблізна 9%).*

1) Ці можам мы далучыцца да гэтага грамадзянскага руху?

2)Што для гэтага трэба рабіць?

**IV. Кантрольна-рэфлексійны этап.**

1) Адзін з герояў фільма сказаў так: "Калі я 5 хвілін на дзень буду дапамагаць Зямлі, душа мая стане чысцейшай, а рукі заўсёды можна вымыць". (З фільма

“Мяне клічуць Эрл”) Паразважайце над гэтым выказваннем і , магчыма, ваш погляд на акаляючы свет  таксама зменіцца.

2)Ці змаглі мы з вамі “адшліфаваць” свае веды па тэме “Лічэбнік”? Якія заданні выклікалі цяжкасць? Ці адчулі вы сябе больш упэўнена па гэтай тэме?

**V. Дамашняе заданне.**

1)Зайсці на старонку “target 99” у “Вконтакте” і выпісаць 4-5 сказаў з цікавымі статыстычнымі дадзенымі (лічэбнікі запісаць словамі).

2)Паўтарыць праблемныя моманты тэмы “Лічэбнік”, падрыхтавацца да пісьмовай работы.